*Караткевіч В.І., Шарапава А.В. (Магілёў)*

# Асаблівасці выкарыстання твораў Максіма Багдановіча ў кантэксце рэалізацыі псіхолага-педагагічных задач дашкольнай адукацыі

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі, якія былі ўведзены з 1 верасня 2011 г., а таксама з праграмай «Пралеска» прыярытэтнымі задачамі дашкольнай адукацыі з'яўляюцца: развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту, фарміраванне яго маральных норм і набыццё сацыяльнага вопыту. Цяжка ўявіць вырашэнне гэтых задач без знаёмства дзяцей з лепшымі ўзорамі мастацкай літаратуры.

Праграма дашкольнай адукацыі «Пралеска» ўтрымлівае спісы рэкамендуемых твораў мастацкай літаратуры і фальклору. Але, думаецца, выхавацель можа ўносіць свае карэктывы ў гэтыя спісы, дапаўняць іх (з улікам індывідуальных асаблівасцей дзяцей) іншымі творамі класікаў сусветнай дзіцячай літаратуры. Дзецям 5–7 год сярод іншых твораў айчыннай літаратуры прапануецца для асэнсавання верш М. Багдановіча «Зімой». Багатая спадчына гэтага пісьменніка дае магчымасць увесці і іншыя яго творы ў працэс атрымання дашкольнай адукацыі.

Адным з найбольш цікавых жанраў літаратуры для дзяцей старэйшых груп з'яўляецца літаратурная казка, якая знаёміць іх з рэчаіснасцю і сацыяльнымі пераўтварэннямі. Адзначым, што дашкольнікі яшчэ не маюць навуковых уяўленняў пра свет, што, з аднаго боку, спрыяе больш эфектыўнаму ўспрыманню імі казачнага зместу, а з другога – пашырае магчымасці педагога па выкарыстанні казкі ў наступных кірунках другога базіснага блока: «Я і свет вакол мяне», «Развіваемся ў дзейнасці».

Так, казка М. Багдановіча «Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык» уяўляе сабой твор з багатымі патэнцыяльнымі магчымасцямі; яе мастацкі свет дапамагае дзіцяці адкрыць для сябе новае. Прапанаваная дзецям старэйшага дашкольнага ўзросту (5–7 гадоў), яна спрыяе фарміраванню свядомасці наступных трох тыпаў адносін.

1. *Фарміраванне адносін да родных і блізкіх, а ў перспектыве і да іншых людзей.* У казцы М. Багдановіча паказваецца няўдалае сямейнае жыццё камара і мушкі, і выхавацель мае магчымасць

рэалізаваць задачы важнейшага арыенціра першага базіснага блока праграмы «Пралеска» – «Супрацоўнічаем з сям'ёй».

2. *Фарміраванне адносін да прадметаў і з'яў рэчаіснасці.* Казка знаёміць дзяцей з беларускімі абрадамі вяселля і пахавання; яна спрыяе апасродкаванай выпрацоўцы негатыўных адносін да гультайства, а таксама вывучэнню найбольш характэрных рыс насякомых (*«Чмель пузаты на басолі гучна грае»* [1, с. 281], *«Восы ў шатах чорных з жоўтымі стракамі»*, *«Мураўёўна нізка звесіла галоўку, / Бо занадта зацягнулася ў шнуроўку»* [1, с. 282]).
3. *Фарміраванне адносін да самога сябе, пазітыўных адносін да «Я».* Пры супастаўленні паводзін камара і мушкі, іх гасцей і ўласных паводзін у дзіцяці развіваецца ўменне суперажываць бліжняму.

Вядомы псіхолаг Л. Выгоцкі адзначаў, што дзіцячая фантазія цесным чынам звязана з назіраннем і *«рухам нашых пачуццяў»* [3, с. 449]. Адсюль вынікае, што пры знаёмстве з казкай варта абапірацца на сацыяльны вопыт дзяцей («А што вы ведаеце пра вяселле?», «Як трэба паводзіць сябе ў гасцях?») і іх творчасць. Можна прапанаваць дашкольнікам намаляваць гасцей на вяселлі камара і мушкі, каб замацаваць эстэтычныя ўражанні, атрыманыя падчас чытання казкі.

У старэйшым дашкольным узросце фарміруецца кампетэнцыя адрознення рэальнага і нерэальнага свету, што найбольш эфектыўна дасягаецца пры асэнсаванні і элементарным супастаўленні казак і апавяданняў. У дадзеным выпадку мэтазгодна выкарыстоўваць празаічныя творы М. Багдановіча «Катыш», «Чудо маленького Петрика», «Марына». Апошняе апавяданне (у ім дзяўчынка Марына, «каторай цяпер ужо быў чацвёрты год» [2, с. 76], здольная да эмпатыі – спачування даросламу чалавеку) прызначана найперш для выхавацеля, асабліва выхавацеля-пачаткоўца, бо ілюструе асаблівасці дзіцячай псіхалогіі.

Змест апавядання «Катыш» спрыяе рэалізацыі задач, пастаўленых у другім базісным блоку праграмы «Пралеска», – «Развіваемся ў дзейнасці» («Свет гульні», «Уваходзім у свет прыгожага»). У творы ўзнаўляецца цікавая гульня – качанне яек на свята Вялікдзень. Вобраз хлопчыка Васі, які атрымлівае падарунак («яйцо "катыш" – почти совершенно круглое, пахожее на мячик. Это был прекрасный ка-

тыш!» [2, с. 116]), раскрываецца псіхалагічна. Апавядальнік з тонкім гумарам і веданнем дзіцячай душы адлюстроўвае Васевы ваганні: гуляць ці не гуляць, бо можна страціць катыш: *«С соседнего двора доносятся весёлые крики играющих. Что же он-то? Ведь у него – катыш, и какой ещё катыш! А пройдёт неделя, перестанут катать яйца, – к чему тогда будет Васе он?»* [2, с. 120]. Нездарма апавяданне мае падзагаловак «З дзіцячага жыцця». Ён можа стаць адпраўным пунктам для стварэння выхавацелем цэлай серыі рознага кшталту заняткаў.

Прапанаваўшы дзецям гэты твор, можна ў кантэксце адной з задач структурнай часткі праграмы – «Уваходзім у свет прыгожага» («знаёміць дашкольнікаў з літаратурнымі творамі, прысвечанымі святочным і памятным дням» [5, с. 249]) – расказаць пра свята Вялікдзень, а таксама папрасіць дзяцей скласці аповед пра ўласныя ўражанні ад гэтага свята, наладзіць абмен велікоднымі падарункамі ў групе. Гэта дапаможа рэалізацыі важнай задачы дашкольнага выхавання – «фарміраваць асэнсаванне <…> этнічнай прыналежнасці (*дзіцяці.* – *В. К., А. Ш.*) да пэўнай культуры, народа <…> фарміраваць павагу да нацыянальных культур іншых людзей» [5, с. 217]. Устаноўка на ўзнаўленне жыццёвага эпізоду дае магчымасць акцэнтаваць увагу дзяцей на жанравых асаблівасцях апавядання (яно «лічыцца больш блізкім да не пераўтворанай па-творчы рэальнасці» [4, сл. 856]), што таксама адпавядае задачам праграмы «Пралеска»: «развіваць здольнасць слухаць літаратурныя творы, адрозніваць іх жанры (казка, апавяданне, верш, малыя формы фальклору) і тэматыку» [5, с. 250].

Апісаную ў апавяданні «Катыш» гульню можна выкарыстаць у дзіцячым садку. Яна рухавая, а значыць, служыць стымуляцыі фізічнай актыўнасці дзіцяці, як і іншыя гульні з прадметамі (бадмінтон, кеглі і г. д.). Твор насычаны элементамі дзіцячай субкультуры (разнастайныя лічылкі, слоўныя формулы пры закладзе), што спрыяе вырашэнню задачы «фарміраваць камунікацыйныя ўменні, важныя для поспеху ў сумеснай гульнёвай дзейнасці, сацыяльную арыентацыю на партнёраў па гульнях; падтрымліваць імкненні і спробы пераадолець міжасобасныя канфлікты ў гульні мірным шляхам, выкарыстоўваючы прыёмы гарманізацыі адносін» [5, с. 243].

Апавяданне «Чудо маленького Петрика» знаёміць рэцыпіентаў з вобразам хлопчыка-летуценніка. Для дзяцей старэйшых груп характэр-

на актыўнае развіццё фантазіі, таму яны з лёгкасцю зразумеюць Петрыка, які шукаў цуд удзень і ўночы *«в бездонной лазури этого удивительного изголубо-золотистого неба <...> в прозрачно дрожащей синеве воздуха, в таинственном трепете изумрудной листвы...»* [2, с. 79].

Гэты твор утрымлівае вялікую колькасць мастацкіх тропаў і стылістычных фігур, што спрыяе рэалізацыі задачы «садзейнічаць развіццю здольнасці атрымліваць асалоду ад мастацкай літаратуры, развіццю паэтычнага слыху, пачуцця мовы, фарміраванню ў дзяцей здольнасці эмацыйна адгукацца на выразна-выяўленчыя сродкі мастацкага твора, адчуваць іх прыгажосць» [5, с. 250–251]. Выхавацель можа папрасіць дзяцей праілюстраваць апавяданне. Падобная дзейнасць будзе стымуляваць крэатыўныя здольнасці выхаванцаў, развіваць іх эмацыйнасць.

Такім чынам, уключэнне твораў М. Багдановіча ў кантэкст праграмы дашкольнай адукацыі дае багатыя магчымасці для рэалізацыі разнастайных псіхолага-педагагічных задач.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 2001. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды.
2. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 2001. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды.
3. Выготский, Л.С. Собр. соч. : в 6 т. / Л.С. Выготский. – М., 1982. – Т. 2 : Проблемы общей психологии.
4. Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина; Ин-т науч. инфор. по общ. наукам РАН. – М., 2003.
5. Пралеска : программа дошкольного образования / Е.А. Панько [и др.]. – Минск, 2010.